МІНСКАЯ ПРАЎДА 

Напярэдадні падзеі

# Аснова асноў — чыстая душа

***Неўзабаве пройдзе духоўна-асветная праграма "Сям'я — яднанне і любоў". Ажыццяўленне яе — самы галоўны, прытым доўгатэрміновы праект выдавецтва Беларускага экзархата. Пра тое, якія набыткі мае і якімі планамі яно жыве, чытачам "Мінскай праўды" расказвае выканаўчы дырэктар выдавецтва Беларускага Экзархата Уладзімір ГРОЗАЎ.***

— Нашага выдавецтва не было б, калі б прыкладна пятнаццаць год назад у Мінску на вуліцы Прытыцкага не пачалося будаўніцтва храма ў гонар

**фічнага выканання.**

— Гэта сапраўды так. Нашы кнігі неаднаразова ўдастойваліся ўзнагарод на міжнародных кніжных конкурсах. Тройчы — рускага экзархата. Гэта дыплом першай ступені за кнігу "Праваслаўная ікона Расіі, Украіны і Беларусі" і дыплом трэцяй ступені за кнігу "Ойча наш. Малітва Гасподня".

**— Наколькі вядома, вы не абмяжоўваецеся толькі выдавецкай дзейнасцю.**

— На сённяшні дзень выдавецтва Беларускага экзархата — буйнейшы асветны цэнтр праваслаўнай царквы ў Рэспубліцы Беларусь. Рэгулярна арганізоўваем лекцыі, прэзентацыі, выставы духоўнай літаратуры ў

родных конкурсаў — у Мінску і ў польскай Гайнаўцы — сярод акадэмічных хораў. Выдавецтва даўно і плённа супрацоўнічае з творчымі саюзамі нашай краіны, такімі, як Саюз пісьменнікаў, Саюз кампазі-



святыя мошчы ў Кіева-Пячэрскіх пячорах. Аён жа волат, ідэал сапраўднага мужчыны. Таму царква і мужчынскі пачатак — гэта словы-сінонімы. І калі гаварыць пра тое, як вярнуць мужчыну ў сям'ю, дык для гэтага спярша хлопчыка трэба вярнуць у царкву.

**— А якія планы ў выдавецкай дзейнасці?**

— У хуткім часе маем намер завяршыць унікальны выдавецкі праект, які ажыццяўляем сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, — выпусцім факсімільнае выданне знакамітага Слуцкага Евангелля. На сённяшні дзень у свеце захоўваецца толькі адзін асобнік гэтага унікальнага пісьмовага помніка, які адносіцца да XVI стагоддзя. Ён быў перададзены вернікамі Высокапраасвяшчэннейшаму Мітрапаліту Мінскаму і Слуцкаму Філарэту, Патрыяршаму экзарху ўсяе Беларусі. Несумненна, што выхад яго стане сусветнай падзеяй у галіне кнігавыдання. Мы вельмі шчас-

іконы "Усіх Тужлівых Радасці". Тады на гэтым месцы з'явілася звычайная армейская палатка, якую я ўстанаўліваў сваімі рукамі. Дарэчы, мая жонка пазней стала адной з першых настаўніц нядзельнай школы, якая сёння з'яўляецца буйнейшай сярод аналагічных навучальных устаноў краіны, у ёй займаецца больш за 600 дзяцей. З цягам часу выдавецтва і пераехала ў адзін з будынкаў, што знаходзяцца на тэрыторыі храма. За дзесяць год сваёй дзейнасці выдавецтва Беларускага экзархата заняло лідзіруючае становішча ў праваслаўным кнігавыданні. Штогод выходзяць сотні найменняў кніг самай разнастайнай тэматыкі: мастацкія, дзіцячыя, навукова-папулярныя, багаслужэбныя, багаслоўныя выданні. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца кнігі па гісторыі праваслаўнай царквы, серыя выданняў рускай рэлігійнай філасофіі, кнігі па гісторыі праваслаўя на беларускай зямлі, розныя малітвасловы.

**— Нельга не адзначыць, што кнігі выдавецтва Беларускага экзархата традыцыйна адрозніваюцца высокім узроўнем рэдакцыйнай падрыхтоўкі, мастацкага афармлення, паліграф-**

у 2006, 2007, 2008 гадах — выдавецтва было адзначана вышэйшай узнагародай нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі" — "Залаты фаліянт". У прыватнасці, па выніках нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі-2009" яно стала пераможцам у намінацыі "Лепшае духоўна-асветнае выданне" за кнігу "Ойча наш. Малітва Гасподня", атрымала дыпломы І і ІІ ступеней у намінацыі "Лепшае даведачнае выданне" за кнігу «Праваслаўныя святы» і за серыю кніг «Град славян»; было ўдастоена дыплома І ступені ў намінацыі "Лепшае мініяцюрнае выданне" за кнігу ў трох частках "Праваслаўныя цудатворныя іконы Маці Боскай", а таксама дыпломаў у іншых намінацыях за кнігі "Адзінокі шлях" іераманаха Рамана, «Праваслаўная ікона Расіі, Украіны і Беларусі» і "Апостол". Апрача таго, па выніках VI міжнароднага конкурсу дзяржаў — удзельніц СНД "Мастацтва кнігі", што праходзіў у Маскве ў чэрвені сёлетняга года, з сямі ўзнагарод, якія атрымала Беларусь, дзве належаць выдавецтву Бела-

*За дзесяць год сваёй дзейнасці выдавецтва Беларускага экзархата заняло лідзіруючае становішча ў праваслаўным кнігавыданні.*

бібліятэках, установах культуры і адукацыі, вядзём вялікую работу са СМІ, актыўна супрацоўнічаем з міністэрствамі інфармацыі, адукацыі, культуры, унутраных спраў, абароны і іншымі дзяржаўнымі ўстановамі. Выдавецтва Беларускага экзархата з'яўляецца актыўным распаўсюджвальнікам духоўна-асветнай літаратуры ў Еўропе. Сярод яго партнёраў — прыходы, манастыры, бібліятэкі, школы з краін СНД, Польшчы, дзяржаў Балтыі, Украіны, Германіі, Вялікабрытаніі, ЗША. На працягу многіх год склалася добрая традыцыя папячыцельства. Пад нашым папячыцельствам выходзяць у свет газета "Воскресение", часопіс "Врата Небесные", праходзіць фестываль сучаснага хрысціянскага мастацтва "Благавест". Створаны пры выдавецтве мужчынскі хор "Благавест" летась стаў лаўрэатам міжна-

тараў, Саюз кінематографістаў і іншыя. Пры актыўным удзеле выдавецтва ажыццяўляецца сумесны праект Беларускай праваслаўнай царквы і Саюза пісьменнікаў Беларусі — створаны грамадскі савет па маральнасці. Канкрэтным укладам у развіццё супрацоўніцтва паміж дзяржавай і царквой стала праграма "Сям'я — яднанне і любоў", арганізаваная сумесна з Мінскім аблвыканкомам і Слуцкім райвыканкомам у ліпені 2007 года ў Слуцку. Потым былі Жодзіна, Старыя Дарогі, Салігорск. Усюды яна выклікала высокі духоўны ўздым. І вось, нарэшце, Стоўбцы.

**— Думаецца, ажыццяўленне менавіта такой праграмы стала не выпадковым, бо сёння сям'я, па сутнасці, перажывае крызіс. І гэта тычыцца не толькі Беларусі.**

— Сапраўды, мы не выпадкова выбралі менавіта такую



праграму гэтага важнага мерапрыемства, бо сям'я — аснова ўсіх асноў. Моцная, здаровая, жыццядайная сям'я асабліва неабходна цяпер, калі пагаршаецца дэмаграфічная сітуацыя. Калі не прымаць ніякіх мер, то атрымаецца так, што праз некалькі дзесяткаў год не будзе каму выплачваць пенсіі. Дарэчы, у супрацоўнікаў нашага выдавецтва, калі браць у сярэднім, атрымліваецца больш як па тры дзіцяці на сям'ю. Будуць шматдзетныя сем'і, павялічыцца колькасць вучняў. Важны і такі момант: трэба ў выхаванне вярнуць мужчынскі пачатак. У той жа сям'і, у школе. Ёсць і месца, у якім традыцыйна і спакон вякоў існуе мужчынскі пачатак. Гэта — праваслаўная царква. Ніколі да свяшчэннага служэння не дапускалася жанчына. І дыяканы, і святары — заўсёды былі толькі мужчыны. Прыгадаем, дзе знайшоў свой вечны спачын Ілья Мурамец — ягоныя

кнігавыдання. Мы вельмі шчаслівыя ад усведамлення таго, што можам дакрануцца да гэтай старадаўняй святыні і вярнуць яе людзям. Зразумела, што падобных праектаў адзінкі, тым больш яны робяць гонар нашаму выдавецтву. Самая ж вялікая праблема і адначасова самая вялікая наша задача — даць сучаснага станоўчага героя. Сёння, як вядома, інфармацыйнае поле запаўняюць розныя супермены, прапагандуецца насілле, а тыя, хто з'яўляецца сапраўдным сынам сваёй зямлі, хто годна працягвае справу сваіх бацькоў, абыдзены ўвагай. Спадзяюся, што такі герой таксама прыйдзе на старонкі нашых кніг. Наша выдавецтва — дзецішча, народжанае дзейнасцю і малітвамі Мітрапаліта Філарэта. Яго малітвы, яго ўвага да нашай працы дае нам натхненне, падтрымку, а таксама падказвае новыя ідэі. Бог даверыў нам адказную і ўдзячную місію — паказваць хараство і прывабнасць праваслаўя праз кнігу, песню, фільм, і мы імкнёмся як мага лепш выканаць тое, што на нас ускладзена.

**Гутарыў Алесь МАРЦІНОВІЧ.**